# ТВОРЧЫ ПРАЕКТ «ГОД МАЛОЙ РАДЗІМЫ» НА СТАРОНКАХ ГАЗЕТЫ «ЖЕЛЕЗНОДОРОЖНИК БЕЛОРУССИИ»

**П. Л. Дарашчонак**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*pdoroshhyonok@mail.ru*

Даследуюцца публікацыі газеты «Железнодорожник Белоруссии» 2018–2020 гг., прысвечаныя тэматычнаму праекту «Год малой радзімы».

***Ключавыя словы:*** малая радзіма; Беларуская чыгунка; помнікі гісторыі; нацыянальныя традыцыі; раённыя гарады; абласныя цэнтры.

# CREATIVE PROJECT «YEAR OF THE SMALL HOMELAND» ON THE PAGES OF THE NEWSPAPER «ZHELEZNODOROZHNIK BELORUSSII»

**P. L. Doroshchenok**

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: P. L. Doroshchenok (pdoroshhyonok@mail.ru)*

The publications of the newspaper «Zheleznodorozhnik Belorussi» 2018–2020, dedicated to the thematic project «The Year of the Little Homeland», are consiared in the report.

***Key words:*** small motherland; Belarusian railway; monuments of history; national traditions; district cities; regional centers.

Літаральна ўсе карпаратыўныя, галіновыя і ведамасныя выданні Беларусі прымалі актыўны ўдзел ва ўсебеларускім праекце «Год малой радзімы». З асаблівай увагай да рэалізацыі праекта аднесліся супрацоўнікі рэдакцыі газеты «Железнодорожник Белоруссии». Пачатак гэтай справы быў закладзены ў першыя тыдні 2018 года. Журналісты выдання планавалі пазнаёміць дзясяткі тысяч сваіх пастаянных чытачоў з кожным са 118 раёнаў нашай краіны. На старонках газеты змяшчаліся публікацыі пра лепшых работнікаў Беларускай чыгункі, расказвалася аб дарагіх сэрцу месцах, дзе прайшло дзяцінства і юнацтва, аб тым, як пачынаўся шлях у прафесію. Патрапілі ў аб’ектывы фотакамер і славутыя помнікі нашай мінуўшчыны,

якія, аказваецца, ёсць практычна ў кожным горадзе ці гарадскім пасёлку. Рэалізацыя дадзенага праекта прынесла творчаму калектыву рэдакцыі заслужанае прызнанне – высокае званне лаўрэата рэспубліканскага конкурсу «Залатое пяро – 2020», які штогод праводзіць ГА «Беларускі саюз журналістаў».

Адным са знакавых прыпынкаў у падарожжах журналістаў «ЖБ» па беларускай глыбінцы стаў старажытны Полацк. Дарэчы, маці гарадоў беларускіх у 2022 г. спаўняецца 1160 гадоў. Карэспандэнт Р. Ананьеў у матэрыяле «Скарбы полацкай зямлі» не толькі прадставіў чытачам бясцэнныя жамчужыны самага старажытнага горада краіны – Сафійскі сабор, Спаса-Еўфрасіньеўскі манастыр, Барысаў камень, але і звязаў факты біяграфій мясцовых супрацоўнікаў чыгункі з іх малой радзімай, крыніцай творчых сіл і натхнення. У публікацыі аўтар расказаў аб тым, што натхняла на працу А. Ганчарова – начальніка службы сігналізацыі і сувязі Упраўлення дарогі, Д. Супрэткі – начальніка станцыі Обаль, супрацоўнікаў мясцовага чыгуначнага вузла І. Шалоніка, У. Півеня і інш. У прыватнасці, Д. Супрэтка, які захапляецца гісторыяй і археалогіяй Полаччыны, праводзіў экскурсіі па горадзе ў Дзень беларускага пісьменства [1].

Больш за шэсць стагоддзяў налічвае гісторыя горада Валожына на Міншчыне. Карэспандэнт Г. Меркушэвіч распачала аповед аб гісторыі райцэнтра з падзей сівой даўніны. Горад належаў легендарным князям Валожынскім, потым іх змянілі князі Вярэйскія, Гаштольды, Радзівілы, Сапегі, Сангушкі і інш. Народная памяць захавала імёны дзясяткаў ураджэнцаў Валожыншчыны: Ф. Рушчыца, С. Буднага, В. Дуніна-Марцінкевіча, К. Буйло, першага прэзідэнта Ізраіля Ш. Перэса.

– «У прыгажосць гэтых мясцін немагчыма не ўлюбіцца, – гэта словы Ірыны Лужынскай, якая больш за чвэрць стагоддзя працуе на ст. Багданаў. – Вакол маляўнічая прырода, а колькі помнікаў архітэктуры!» У цэнтры горада знаходзіцца палацава-паркавы ансамбль XIX ст. і касцёл св. Іосіфа, праваслаўная царква Канстанціна і Алёны. У Вішневе, Ракаве, Івянцы дзейнічаюць касцёлы і цэрквы, асобныя з якіх пабудаваныя яшчэ ў XVII ст. З чыгункай, якая пралягла непадалёку ад роднай вёскі Мосцішча, звязаў свой лёс і Мар’ян Касцюкевіч, начальнік дарожнай машыннай станцыі № 71. Па прыкладу бацькоў ён пайшоў працаваць на чыгунку, а пасля перадаў любоў да прафесіі і Валожыншчыны, авеянай легендамі і паданнямі, сваім сынам. З малой радзімай у Мар’яна Касцюкевіча звязаныя самыя цёплыя ўспаміны, а пра свой прафесійны выбар ён ніколі не шкадаваў [2].

У тэматычнай падборцы, прадстаўленай на конкурс «Залатое пяро» ГА «Беларускі саюз журналістаў», сабраныя каля 50 матэрыялаў з патрэтамі вялікіх і маленькіх беларускіх гарадоў, якія ўключаюць штрыхі жыцця

работнікаў чыгункі. Гарадскі пасёлак Акцябрскі з яго рэспубліканскім конкурсам «Берагіня» і Рудабельскай Савецкай Рэспублікай, Старыя Дарогі, у якіх свята шануюць памяць аб героях рэйкавай вайны, Нясвіж – некаранаваная сталіца ВКЛ. Адна з гераінь падарожнага нарыса аб Нясвіжы, намесніца начальніка станцыі Гарадзея Ж. Зянько, працоўную біяграфію пачынала з прыёмаздатчыцы грузу і багажу, працавала білетным касірам, дзяжурным па станцыі: «Мой дзядуля Іосіф Дзямідавіч шмат гадоў быў пуцявым абходчыкам на перагоне Гарадзея – Пагарэльцы. Яго дом знаходзіўся на хутары Студзёнка, побач з чыгуначнымі пуцямі. Як жа мы з сястрой любілі з акна яго дома назіраць за праходзячымі цягнікамі. Мне падабаўся пах чыгункі… Куды б ні закінуў цябе лёс, як бы добра табе ні было, часцінка душы абавязкова застаецца на малой радзіме» [3].

«Не бывает деревьев без корней, есть они и у каждого из нас: семья, отчий дом, – падкрэслівала на старонках газеты карэспандэнт Г. Мелехава. – Но чтобы истоки не иссякали, за ними нужно постоянно ухаживать, заботиться. За минувшие три года, которые в нашей стране прошли под знаком малой родины, работники Белорусской железной дороги не только вспомнили о своих корнях, о тех местах, где прозвучали их первые слова, где до сих пор живут близкие и любимые люди, но и сделали многое для того, чтобы эти уголки стали краше и уютнее» [4].

Кобрын, Салігорск, Гомель, Баранавічы, Воранава, Крупкі, Ліда… Шлях даўжынёй у тры гады пройдзены з творчым натхненнем. Чыгуначнікі і ветэраны Беларускай магістралі з матэрыялаў газеты даведаліся, што ў сталіцы былі высаджаны больш за 1,6 тыс. маладых дрэўцаў у 2020 годзе, а на Алеі памяці, побач са станцыяй Мінск-Пасажырскі, у гонар 75-годдзя Вялікай Перамогі з'явіліся 75 ліп і дубоў. Чыгуначнікі памятаюць аб тых, хто загінуў у баях за Радзіму, даглядаюць больш як 180 памятных месцаў і абеліскаў воінскай славы, размешчаных на прылеглай тэрыторыі Беларускай чыгункі.

Шмат увагі карэспандэнты «Железнодорожника Белоруссии» ўдзялялі ў сваіх публікацыях моладзі. Патрыятычная акцыя Беларускай чыгункі «Я вырос здесь, и край мне этот дорог», конкурсы на лепшае веданне гісторыі Беларусі, нацыянальных традыцый і мовы, сустрэчы ветэранаў дарогі с маладым пакаленнем, прысвечаныя Году малой радзімы і 75-годдзю Вялікай Перамогі, – гэта толькі невялікая частка мерапрыемстваў Беларускай чыгункі, якія дапамагаюць захоўваць багатую гістарычную і культурную спадчыну краіны, памяць аб гераічным мінулым нашага народа.

Крыніцай натхнення малая радзіма стала і для арганізатараў, а таксама ўдзельнікаў культурных і спартыўных мерапрыемстваў, якія адбыліся

ў 2020 годзе. Гэта фотаконкурс «Паклонімся вялікім тым гадам…», прысвечаны 75-годдзю Вялікай Перамогі, фестываль дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Ярмарка фантазий», конкурс «Мы – семья!» сярод шматдзетных сем'яў работнікаў Беларускай магістралі, круглагадовая спартакіяда, чэмпіянаты па валейболе, стральбе з пнеўматычнай вінтоўкі, лёгкаатлетычным кросе і турысцка-прыкладным мнагаборстве і інш.

Сёння на Беларускай чыгунцы дзейнічаюць 9 музеяў, 19 пакояў баявой і працоўнай славы і 2 залы гісторыі, у якіх размяшчаюцца тэматычныя экспазіцыі і выставы, прысвечаныя Году малой радзімы. Толькі ў 2020 годзе музеі наведалі больш як 34 тыс. чалавек, было праведзена каля 360 экскурсій.

Тэма малой радзімы, якая на працягу 2018–2020 гг. асвятлялася на старонках газеты «Железнодорожник Белоруссии», знайшла шырокі водгук у сэрцах усіх работнікаў Беларускай чыгункі, а матэрыялы выдання аб гісторыі, культуры і працы чыгуначнікаў у раённых і абласных гарадах сталі сапраўднай энцыклапедыяй стваральных спраў усіх тых, хто рабіў і робіць вялікі ўнёсак у развіццё сваёй малой радзімы, дарогі і краіны.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Ананьеў Р.* Скарбы полацкай зямлі // Железнодорожник Белоруссии. 2019. 5 янв.
2. *Меркушевич А*. Дорогами Будного, Рущица, Буйло… // Железнодорожник Белоруссии. 2019. 12 янв.
3. *Меркушевич А*. В сердце родной Беларуси // Железнодорожник Белоруссии. 2019. 2 февр.
4. *Мелехова А*. С любовью к малой родине // Железнодорожник Белоруссии. 2021. 23 янв.